Беларусь.info

№3 8/03/2006

*Найдакладнейшае вымярэнне каштоўнасці чалавека — не тое, што ён робіць у час спакою і ўтульнасці, а тое, як ён трымаецца падчас барацьбы і супярэчнасцяў.*

**Марцін Лютэр Кінг**

Грамадская пазапалітычная і пазацэнзурная ініцыятыва. Распаўсюджваецца бясплатна

# Падзеі

**Невядомыя затрымалі прадстаўніка штабу Аляксандра Мілінкевіча В. Вячорку і іншых актывістаў.** Іх захапілі каля 13:30 пасьля сустрэчы кандыдата ў прэзідэнты ля Палаца культуры МТЗ. Мілінкевіч зазначыў, што размова ў гарадзкой міліцыі, куды ён заехаў напісаць заяву, была вельмі напружаная і лёс затрыманых выклікае вялікую незапакоенасць.

**Аляксандр Казулін павіншаваў беларускіх жанчын са святам.** Ён лічыць, што ў хуткім часе ў нашай краіне адбудуцца перамены да лепшага, што дазволіць пазбавіцца сучасных праблемаў і пачуваць сябе годна ў свабоднай краіне.

**Казулін сустрэўся з дзяржаўным міністрам Германіі Эрлерам.** Міністар зазначыў, што Германія і Еўропа цалкам маюць вялікі інтарэс да Беларусі, але як краіны дэмакратычнай, з легітымнай правапераемнасцю ўлады.

# Цытаты

**Сяргей Калякін лічыць, што беларускія ўлады "звар'яцелі ад жаху".** «Осуждение сегодня активистов избирательной кампании -- Владимира Шанцева и Анатолия Лебедько – это полнейший произвол. Дальше идти уже некуда. Растоптаны остатки здравого смысла и приличий при проведении избирательной кампании. Я думаю, что власти обезумили от страха, потому что нет у них никакой народной поддержки.

**Джордж Буш павіншаваў беларускіх жанычын са святам: "**Мы на баку тых жанчын, якія змагаюцца за свае правы і правы чалавека перад сакавікімі выбарамі".

# Факты

**Дадзеныя аб сярэдніх заробках у краінах былога СССР (USD):** Эстония — 593, Литва — 460, Латвия — 430, Россия — 302, Казахстан — 260, Украина — 220, **Беларусь — 214,** Азербайджан —140, Армения — 115, Молдова — 78, Узбекистан — 60, Таджикистан — 28.

# Аб'явы

**9.03.2006 г. у 11:00 адбудзецца экстранная прэсавая канферэнцыя кандыдата ў прэзідэнты А. Мілінкевіча**. Тэма канферэнцыі — затрыманне давераных асобаў кандыдата. Пройдзе мерапрыемства па адрасе Машэрава, 8 (былая Варвашэні, 8).